Viestki546.qxd 8/3/2011 2:15 AM Page 1 (3,1)

Весткі й Паведамленьні
Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня
Viestki j Paviedamlenni
№ 8 (546)
Жнівень 2011 г.

✉ Belarusan American Association, Inc.
P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572

Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org

# Марш Тыдня Паняволеных Народаў

У рамках 53-га Тыдня Паняволеных Народаў 17 ліпеня сёлета прайшоў традыцыйны Марш Паняволеных Народаў, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускай грамады ў Амэрыцы. Марш штогод арганізаоўвае Камітэт Паняволеных Народаў, што паўстаў у 1959 годзе, і які з прынятым прэзыдэнтам Айзэнгаўэрам Грамадзкім законам ЗША № 86-90 арганізуе Тыдзень у гонар змагарных народаў, што пакутуюць пад таталітарнай і дыктатарскай уладай.

Імпрэза пачалася з блаславеньня сьцягоў і імшы за паняволеныя народы ў саборы сьв. Патрыка ў Нью-Ёрку, якую адправіў Мансынёр Рычы, рэктар сабору. У сваёй казані ён выказаў спадзяваньне, што Паняволеныя Народы, прадстаўнікі якіх ужо каторы год ладзяць свай Тыдзень і Марш, неўзабаве даб'юцца свабоды, і нагадаў прысутным, што свабода, змаганьне за яе маюць свой высокі кошт – “Freedom is not free”.

Затым грамада прайшла Маршам па 5-й авэню. У ранішнім паветры лунали бел-чырвона-белыя сьцягі, якіх было найболей, гучэлі поклічы “Жыве Беларусь!”, “Беларусь – так! Лукашэнка – не!”, “Далоў Лукашэнку!” Удзельнікі імпрэзы прайшлі да 72-й вуліцы ў Цэнтральны парк, дзе адбылася ўрачыстасьць адкрыцьця Тыдню Паняволеных Народаў. Яе адкрыў старшыня Камітэту Паняволеных Народаў Хорст Уліх. З прамоваю аб змаганьні за дэмакратыю ў Беларусі й патрэбу салідарнасьці дэмакратычных сілаў выступіў старшыня Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА) Віталь Зайка. У імпрэзе прынялі ўдзел прадстаўнікі Эстоніі, Казакіі, Кубы, Латвіі, Нікарагуа й нямецкіх выгнанчых зямляцтваў, а таксама дзеячы кансэрватыўнага руху ў ЗША.

Напрыканцы імпрэзы была прынятая рэзалюцыя, у якой нагадваецца аб неабходнасьці памятаць аб злачынствах камунізму і таталітарызму, аб пагрозе міру і дэмакратыі, якая дасюль сыходзіць ад такіх тыранічных краінаў, як Кітай і Расея, і аб парушэньнях свабоды веравызнаньня, што адбываюцца ў многіх месцах сьвету.

**Віталь ЗАЙКА**



Viestki546.qxd 8/3/2011 2:16 AM Page 3 (1,1)



# Ліпеньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

У Цэнтральным парку ля помніка каралю і вялікаму князю Ягайлу 17 ліпеня прайшоў сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Перад тым сябры і госьці аддзелу прынялі ўдзел у Маршы Паняволеных Народаў. Падчас кароткага сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка коратка распавёў пра дзейнасьць і пляны аддзелу і, між іншага, узгадаў гісторыю помніка Ягайлу ў Цэнтральным парку, а таксама тое, што ў гэтыя дні ліпеня спаўняецца 601 год перамогі аб'яднаных войскаў старабеларускай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай над сіламі Тэўтонскага нямецкага ордэну пад Грунвальдам у 1410 г.

Прысутныя мелі магчымасьць падаць заявы на сяброўства ў аддзеле і далучыцца да дзейнасьці беларускай грамады ў Нью-Ёрку і ваколіцах, а таксама калегавацца зь землякамі, абменьвацца інфармацыяй пра розныя жыцьцёва патрэбныя рэчы, у тым ліку юрыдычныя паслугі, жытло, працу і вучобу.

**_Віталь ЗАЙКА_**



# 20 год аднаўленьня незалежнасьці Беларусі



У гэтым месяцы, 25 жніўня, спаўняецца 20 год, як у 1991 годзе Вярхоўны савет (парлямэнт) тагачаснай савецкай тэрыторыі БССР, прагаласаваў за наданьне статусу канстытуцыйнага закону для прынятай годам раней, 27 ліпеня 1990 году, Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце. Фактычна і юрыдычна гэта азначала абвешчаньне незалежнасьці Беларусі, стварэньне сапраўднай дзяжавы і нацыянальнага дому для беларускага народу.

Калі ўлічваць пэрыяды, у якія беларускія землі ўжо мелі незалежнасьць – часы Полацкага, Тураўска-Пінскага, Смаленскага княстваў, магутны дзяржаўніцкі ўплыў старабеларускай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, а ў бліжэйшы час – Беларускую Народную Рэспубліку, слаўны чын беларускіх нацыянальных дзеячоў і абвешчаньне незалежнасьці Актам 25 Сакавіка 1918 г., дык 25 жніўня 1991 году ёсьць дзень аднаўленьня незалежнасьці Беларусі, і як такі, гэты дзень мае ўсе падставы зрабіцца ў будучай сапраўды беларускай, незалежнай, дэмакратычнай Беларусі дзяржаўным і народным сьвятам.

Падчас няўдалага путчу артадаксальных камуністычных сілаў адбылося тое, што мае ўсе падставы называцца цудам. Нягледзячы на няпараўнальную розьніцу ў сілах незалежнікаў і камуністаў, інэрцыю савецкага мысьленьня ў народзе, брак ў яго гістарычнай памяці й нацыянальняга пачуцьця, невялікая нацыянальна-вызвольная фракцыя ў парлямэнце, кіраваная Зянонам Пазьняком, змусіла камуністычна-прарасейскую большасьць пагадзіцца на абвешчаньне незалежнасьці. Давід перамог тады Галіяфа, і тая бліскучая, маланкавая перамога спарадзіла адчуваньне лёгкасьці й неспадзяванасьці прыходу аднoўленай незалежнасьці.

Забарона дзейнасьці кампартыі, увядзеньне 19 верасьня 1991 г. нацыянальных дзяржаўных сымболяў і новай назвы дзяржавы, пашырэньне беларускамоўнай адукацыі й паступовы ўваход у сілу

**_Заканчэньне на бачыне 4_**

Viestki546.qxd 8/3/2011 2:16 AM Page 3 (3,1)



# 96 год былому старшыні Галоўнай управы БАЗА Антону Шукелойцю

Сёлета 19 ліпеня споўнілася 96 год Антону Шукелойцю, выдатнаму дзеячу беларускай грамады ў Амэрыцы, былому старшыню Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). З гэтай нагоды кіраўніцтва аддзелу зрабіла сьціплае сьвяткаваньне для сп. Шукелойця ў адной з рэстарацыяў.

Сп. Антон Шукелойць нарадзіўся ў 1915 г. у в. Якелеўшчына на Ашмяншчыне, недалёка ад Жупранаў, у сялянскай сям'і. Ён пачаў палітычную дзейнасьць у Заходняй Беларусі, належаў да маладзёвага гуртка беларускіх эсэраў, зарганізаванага А. Барановічам. У 1931 г. падчас перапісу насельніцтва А. Шукелойць быў перапішчыкам, "камісарам сьпісовым", і зь некалькімі сябрамі запісваў адказы адносна мовы не па тым, якой мовай карыстаюцца ў касьцёле, але на якой мове размаўляюць у сям'і. У выніку па гміне працэнт беларускага насельніцтва істотна адрозьніваўся ад суседзяў, што выклікала гнеў польскіх уладаў. За гэта Антон Шукелойць зь сябрамі не былі дапушчаныя да матуры, здавалі іспыты на год пазьней. Потым паступіў у Віленскі ўнівэрсытэт на факультэт гуманістыкі, вывучаў этнаграфію і мовазнаўства. Сярод выкладчыкаў былі славутыя навукоўцы этнограф Казімер Мушынскі, і славіст Эрвін Кашмідэр.

Належаў да Беларускага Студэнцкага Саюзу. Сярод сяброў-студэнтаў былі будучыя грамадзкія і культурніцкія дзеячы Мікола Шчорс, Вітаўт Тумаш, Мар'ян Пецюкевіч, музыколяг Генадзь Цітовіч. Браў удзел у беларускай грамадзкай дзейнасьці, быў сябрам Партыі беларускіх эсэраў і супрацоўнічаў з такімі асобамі як Тамаш Грыб, Макар Краўцоў-Косьцевіч, Мікола Шыла, Паўліна Мядзёлка, Мікола Чарнецкі.

Падчас жыцьця ў Вільні сп. Шукелойць меў цесныя дачыненьні зь Беларускім музеем у Вільні, і зь ягоным дырэктарам Антонам Луцкевічам і супрацоўнікам Уладзімерам Самойлам. Добра ведаў выдаўца Янку Пазьняка, кіраўніка хору Рыгора Шырму, кс. Адама Станкевіча, Язэпа Найдзюка, Міколу Шкялёнка, літаратуразнаўцу Станіслава Станкевіча, мовазнаўцу Янку Станкевіча, пасла на Сойм Фабіяна Ярэміча, паэтаў Максіма Танка, Міхася Машару. Некалькі гадоў быў старшынём Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы.

З прыходам саветаў быў абраны дэпутатам ашмянскага агрсавету, потым прызначаны савецкімі ўладамі інспэктарам ашмянскага аддзелу асьветы, арганізоўваў беларускае школьніцтва на Ашмяншчыне. Напачатку савецка-нямецкай вайны сп. Шукелойць быў арыштаваны як беларускі буржуазны нацыяналіст. Нягледзячы на вайну, пасьпеў пабыць у савецкіх турмах ў Ашмяне, Вялейцы і Крупках. Потым А. Шукелойць перабраўся ў Менск, дзе з прыходам нямецкай цывільнай адміністрацыі беларускія дзеячы імкнуліся пераняць кіраваньне дзеля дапамогі церпячаму ад вайны беларускаму народу. Пад нямецкай акупацыяй быў загадчыкам Беларускага музэю ў Менску, адначасна браў удзел у працы беларускіх падпольных незалежніцкіх сілаў, у тым ліку Беларускай Незалежніцкай Партыі (БНП).

На пасадзе дырэктара музэю ў Менску сп. Шукелойць шмат зрабіў дзеля ратаваньня культурных каштоўнасьцяў, што бальшавікі кінулі на волю лёсу, і якія рабаваліся немцамі. У выніку ягоных захадаў былі выратаваныя старыя абразы, у тым ліку ікона Божае Маці Менскае, палотны Ю. Пэна, стадрукі, мэбля, царкоўнае начыньне ды іншыя каштоўнасьці. Сп. Шукелойць браў удзел у працы Царкоўнага сабору БАПЦ у Менску і пасьля прыняцьця пастановы аб аўтакефаліі выступіў з прывітаньнем ад каталікоў.

Са стварэньнем БЦР працаваў у аддзеле культуры Рады БЦР, разам з Н. Арсеньневай і М. Куліковічам. Падрыхтоўваў выбары дэлегатаў на Другі Ўсебеларускі Кангрэс ад Палесься, і сам быў дэлегатам Кангрэсу, браў удзел у ягонай працы ў 1944 г. З набліжэньнем савецкіх войскаў падаўся на выгнаньне, перш у Нямеччыне, потым у 1950 г. перабраўся ў Амэрыку, у Нью-Ёрк.

Сп. Шукелойць шмат зрабіў для кансалідацыі беларускіай грамады ў ЗША, браў чынны ўдзел у стварэньні беларускіх нацыянальных і рэлігійных арганізацыяў у Амэрыцы, у т. л. БАЗА і БІНіМ, спрыяў умацаваньню БАПЦ. Браў удзел у працы Рады БНР, рэдакцыі газэты "Беларус", дзе таксама апублікаваў шэраг артыкулаў. Доўгі час (1975-2007 гг.) быў старшынём Галоўнай управы БАЗА.

Сп. Антон Шукелойць вельмі шмат зрабіў для падтрымкі новай хвалі іміграцыі 1990-х-2000-х гг., дапамагаў матэрыяльна, духова і даваў парады, як хутчэй стаць на ногі ў новым краі. Сп. Шукелойць дасюль застаецца актыўным удзельнікам беларускага грамадзкага жыцьця ў ЗША.

**Віталь ЗАЙКА**

**На здымку:** *Віталь Зайка, Васіль Кузьменка, Антон Шукелойць, Валянціна Якімовіч.*



Viestki546.qxd 8/3/2011 2:19 AM Page 1 (1,1)



# 20 год незалежнасьці

**_Заканчэньне з бачыны 2_**

Закону аб мовах, афіцыйны кляпец ужо фактычна памерлага СССР стваралі ўражаньне нябачных дасюль пэрспэктываў нацыянальнага разьвіцьця для беларусаў, адчуваньне незваротнасьці зьменаў да лепшага ў нацыянальным жыцьці.

Аднак рэальная сытуацыя нацыянальнага нігілізму, грамадзкая апатыя большасьці беларусаў, адсутнасьць якой-кольвечы палітычнай традыцыі, за выняткам пары гадоў хаатычнай “перабудовы”, вывелі на паверхню грамадзкага жыцьця папуліста Лукашэнку, які, поруч з імітацыяй барацьбы з карупцыяй, абраў змаганьне з беларускасьцю, як свой галоўны “конік” для прыходу да ўлады. Здабыцьцё ўлады Лукашэнкам у ліпені 1994 г. праз дэмакратычныя працэдуры можна параўнаць да выбараў 1933 году ў Нямеччыне, і гэта кладзецца на цэлы народ цёмнай плямай, якая будзе змытая толькі тады, калі беларусы гэтак-жа масава, як галасавалі ў 1994 г. за Лукашэнку, возьмуць удзел у пазбаўленьні ад тыраніі.

20 год незалежнасьці выклікаюць двайістае пачуцьцё. З аднаго боку, гэта 20 год змарнаваных шанцаў, пэрыяд страчаных ілюзіяў; час, у які адыйшло ў вечнасьць пакаленьне нацыянальных дзеячоў і натуральных носьбітаў беларускай мовы. За 20 міжваенных год у 20 ст. нашыя суседзі – латышы, палякі, летувісы стварылі моцныя падваліны нацыянальнага існаваньня, што дапамаглі кожнай нацыі вытрываць выпрабаваньні 20-га стагодзьдзя, нацызм і камунізм. Падваліны тыя – перш за ўсё духовыя, заснаваныя на каштоўнасьцях нацыі. У сёнешняй Беларусі незалежніцкія падваліны, парадаксальна, таксама ўзмоцніліся. Ды падваліны гэтыя – мэханічныя, бяздушныя, заснаваныя на хлусьні, прымусе, на амоне і спэцназе.

Аднак, як пісаў паэт; “Час паплавіць татальныя лёды, хіба й нас не пакіне на крызе”. Беларуская крыга тыраніі раней ці пазьней растане, і час гэты актыўна набліжаюць нацыянальна-дэмакратычныя сілы, моладзь, усе людзі, якім спадае з вачэй заслона папулізму і хлусьні, створаная рэжымам Лукашэнкі. Цяпер ужо час задумацца, якім зьместам напоўняць нашыя сучасьнікі і мы самыя, адноўленую незалежнасьць найноўшага часу, што бярэ пачатак у слаўнай падзеі 25 жніўня 1991 году.

**_Віталь ЗАЙКА_**



**_Валянцін Голубеў, Зянон Пазьняк і Вольга Галубовіч 24 жніўня 1991 г._**

---

_Сардэчна віншуем зь днём нараджэньня Ўладыку Юрыя і зычым моцнага здароўя і вытрываласьці на Божай ніве._

**_Кіраўніцтва аддзелу БАЗА_**

---

**Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА**
Складкі й ахвяраваньні:

**В. Бітус** ........................ **.50**
**А. Сарока** ...................... **.50**
**І. Шашчук** ..................... **.50**
**І. Язерская** ................... **.50**

**Усім шчыры дзякуй!**

---

**Уплаты ў аддзел шліце на адрас:**
_Belarusan American Association_
_P. O. Box 572_
_New York, NY 10113_
**Чэкі выпісвайце на**
_Belarusan American Association._

---

_Шаноўныя сябры!_

_Калі Вы атрымліваеце бюлетэнь **“Весткі й Паведамленьні”** як сябар Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, але не рабілі ахвяраваньняў на ягонае выданьне, калі ласка, паведаміце рэдакцыі (поштаю ці е-мэйлам) аб жаданьні атрымліваць бюлетэнь і, па магчымасьці, падтрымайце выданьне фінансава._

---

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу 13-га жніўня 2011 г.** на Мангэтане**.**

Месца правядзеньня сходу:

**_Seafarers and International House_**
**_123 East 15th Street_**
**_New York, NY 10003._**

_Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**._

_Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place._

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

---

_Паважаныя **В. Пасько, Ш. Саркісян, І. Сулім, Ю. Сямашка** паведаміце, калі ласка, рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы._

---

**Ахвяравалі на выданьне бюлетэня**
_Весткі й Паведамленьні_ :

**В. Аўдзеева** .................... **.30**
**В. Бітус** ........................ **.30**
**А. Вяроўка** .................... **.30**
**А. Сарока** ...................... **.30**
**І. Шашчук** ..................... **.30**
**І. Язерская** ................... **.30**

**Шчыры дзякуй!**

---

_Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі ($30). Чэкі выпісвайце на імя **Belarusan American Association**._

_Рэдакцыя бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя ў рэдакцыю артыкулы, водгукі й лісты._

_Допісы накіроўвайце на адрас:_
**_VIESTKI_**
**_P. O. Box 3225_**
**_Farmingdale, NY 11735_**
_альбо на адрас электроннай пошты:_
**_viestki@mail.com_**